Цана асобнаго нумэру 5 кап. (10 грошэй).

№ 5. Вильня, 18 наябра 1906 г.

Год I.

НАША ДОЛЯ

першая беларуская газэта для вескоаго и местоваго рабочаго народа.

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литэрами.

Адрэс рэдакции и администрации: *Вильня, Катэдральны плац, № 4.*

Тэлефон Рэдакции и Канторы № 591.

Цана: з перасылкаю и дастаукаю да хаты: на 1 год— **3 руб.**, на 6 месяцоу—**1 руб. 50 кап.**, на 3 мѣс.—**75 кап.**, на 1 мес.—**25 кап.** Без дастаўки и пересылки: на 1 год—**2 р. 40 к.**, на 6 мес.—**1 р 20 к.**, на 3 мес.—**60 к.**, на 1 мес.—**20 к.** За границою: на **1 год—4 р.**, на 6 мес.—**2 р.**, на 3 мес. **1 р.** Перамена адрэсу—**20 кап.**

АБЪЯУЛЕННЯ прыймаюцця на паследняй страницы па **20 кап.** за линейку пэтиту.

Рукаписы и карэспандэнции, прысыланыя у Рэдакцию, мусяць быць чытэльна написаны з фамилею и адрэсамъ таго, хто іх присылае. Адрэсъ толки для вадама Редакции.

Усюду кроу.

Эх, мачь- прырода, мачь зямля,
Ты уся у крави патонешь скора!
У слезах гниець уж грудзь твая
Ты хата жалю и пазора.

Не пасьпеваець абсушиць
Пал солнца крови краснай лужы.
Не пасьпеваюць их пакрыць
Снегами вихры шумнай стужы.

Не пасьпеваюць их абмыць
Дажджей патоки праливные...
Кали же кроу прастануць лиць
И сцихнуць усе бяды людзкія?

Ня уж, зямля, о мачь—зямля,
Мир доугажданны—плод запрэтный?
Ня уж ня устанець нам зара
Любви усеобщай бэззаветнай?

I. ИЗГУР.

Да чытацёлеу.

Па прычынам, ад мяне не залежным, „Наша Доля“ была перастаушы выхадзиць. Шмат прыйшось цяжкаго на долю „Нашае Доли“. Шмат ужо перацярпела яна и ящэ хыба ня мала цярпець прыйдзецца. Она жеш, крыху аправиушись ад усих бед, што на мяне навалились, зноу пачынаю выдаваць „Нашую Долю“, зноу иду служыць беднаму, скрыуженнаму вёсковаму и местовому рабочему народу.

„Наша Доля“ як раней, так и цяпер будзе бараниць справы мужыцкае и усей працавитай бедноты.

Дзякую усем маим прыяцелям, што да гэтуль писали да „Нашае Доли“ и прашу не забываць и писаць зноу.

У Вильни цяпер выдаюць другую беларускую газэту, называецца яна „Наша Нива“.

Дзеля таго жэ „Наша Доля“ не выхадзила, шмат людей думали, же „Наша Нива“ выходзиць уместа „Нашае Доли“. Дык я заяуляю вельмипаважаемым чытацелям, же “Наша Доля“ николи ничога агульнаго ня мела и ня маець з Нашае Нивай“.

Янук Тукеркес.

Аб выбарах у Гасударственую Думу.

Прэдвыбарную агитацию ужо пачали.

Найперш усих прыступили да пяе паны: у дзерэунях паны-памешчики, а у гарадах — фабрыканты, купцы ды усе багатые людзи.

Паспяшили яны так дзеля таго каб пасьпець правесьци у Думу сваего дэпутата, такого же пана, як и яны сами и каторый будзе бараниць не мужыцкае справы и усей працавитай беднаты, а паноу ды багатых людзей.

Бо и не дзивота. Такий пан-дэпутат... ну як жеш ен будзе бараниць мужицкае справы? Кали тое што патребна для мужыкоу—для паноу смерць.

Мужыкам патрэбна зямля и свабода. А кали даць мужыкам свабоду, дык з каго жешя паны будуць шкуру дзерци, як гэта было раней и цяпер?

Паны ды бюракраты баяцца, каб у новую цяперэшнюю Думу, як у першую, ня выбрали праудзивых прыяцелеу народа, громкій голас каторых пранёсся па усему гасударству...

Гэта быу голас прауды; ён не знау литосьци ни для правицельства, ни для паноу и бюракратау.

Вот гэтаких дэпутатау нам патрэба, каторые смела баранили бы мужыцкае справы и дабивались бы палепшення жыцця як мужыка-беларуса, так и усей працавитай беднаты, што жывець у нашым краю.

А таким для нас дэпутатам можець быць тольки такий, каторый выгадавауся у нашай бядзе и нядоли и на уласнай спине насиу паноу-бюракратоу з их парадками.

Адзин и глауный ворог як вёсковаго, так и местоваго беднаго рабочаго народу, гэта нядоля и цемната, проциу каторай павинна уся працавитая бедната ваеваць як адзин чэлавек, не разглядаючи якой ён веры и народнасьци: чы гэта праваслауный, чы католик, чы жыд, чы руский, чы паляк, чы литвин, чы латыш, чы немец, чы татар, чы армянин, чы калмык и шмат яшче других, каторые жывуць у цэлым нашем вяликам гасударстве. Усё гэта браты нашы па бядзе и нядоли.

Дык вот жеш и трымайцеся разам, не завадзице адзин з другим сварок, выкиньце зэ свайго серца тую ненависьць адзин да другога, каторую вашы вороги у вас засяваюць, каб вы у гэтай братаубийсцвеннай вайне патрацили сваи силы и не магли ваеваць з праудзивыми вашими ворогами и гныбицелями.

Ведайце добра, же пакуль вы усе разам — вы сила, а як разлучицеся ды пойдзеце кожный па сабе, дык тады вас перадушаць, як мух.

Вазьмице куль саломы и папрабуйце яго зламаць.

Якой бы челавек ня быу, а целаго куля ня зломиць, а як развязаць куль ды па горстачце—дык и малы дзяцюк ня тольки куль, але и цэлый воз саломы переламае. Такъ сама гэта и з вами.

Выбираючи сваих выбарных, глядзице на гэта заусим трэзва. Не падавайце сваих галасоу за тых, што будуць вас паиць гарэлкаю, чы будуць даваць грошы, каб тольки их выбраць. Яны вам будуць шмат чаго абецаць, але вы у тые абецанки ня верце, бо гэта воуки у авечых шкурках. И гарэлка их ня раз вам выльецца горкими слезами, а кожнюю капейку прыйдзецца рублём заплациць.

Аб народовых демакратах, (Н.-Д.).

У цяперашние урэмя, как начынаюцца выбары у Гасударственую Думу, усякая партия хочець выставиць свайго кандыдата. Ведама, што у гэтау барбе лепшае места прынадляжиць тым партиям, каторые вядуць дружбу з правицельствам—партиям паноу и багачей. Яны имеюць права ззываць сваи прадвыбарныя зебрання, могуць смела агитаваць за сваими кандыдатами, не баючись таго, же их арыштуюць.

У насъ, у Вильни, паны, багачы и чыноуники пазлучались так: рускіе—у „саюз 17 акцября“, а паляки—у „народовых дэмакратау“ (н.-д. эндекау,) и у „канстытуцыонна-католическую партию“ (к.-к.).

З памеж них пакуль што шумиць партия эндэкау. Аб ней мы и хочэм цяпер пагаварыць.

Да партии „Н.-Д.“ належыць тольки не вялика жменька мужыкоу ды работникоу, а больш паны. Тые рабочые и мужыки, што належаць да „Н.-Д.“, папали сюды праз ашуканства. Ашукаць цёмнага и даверчывага чэлавека ня трудна таму, хто праз цэлый свой век гэтым тольки и жыу.

„Н.-Д.“ на славах дык абецаюць беднаму народу, што яны будуць для няго и тое и другое дабро рабиць, усюды будуць бараниць справы усяго беднага люду и бэз мала тры неба не наабецаюць.

На славах дык гэта выходзиць надтаж пенкне, але пагляздим, як яно выходзиць на дзеле?

Партия „Н.-Д.“ у Вильни надтаж не велика и ничым яще не паказала сябе. Але приглянемся да таго, што робиць гэта же самая партия у Царстве Польскам. Там яна сильная дзеля таго, што пачала сваю работу у тое урэмя, кали чыноуничьс правицельства да таго цяснило усё польскае, што народ найперш усяго стараууся асвабадзиць сваю народовасьць з пад уласьци гэтых душыцелеу народа. А дзеля таго, же „Н.-Д.“ дабивались таго же самаго, то и шмат людзей да яго прилучыуся, веручы на слово другим ихным абетницам.

Хто усеми силами старающа прашкодзить рабочым у вайне з фабрыкантами, мешаючы забастоукам и для гэтай цэли занималися навэт даносами?

Народовые дэмакраты.

Хто усеми силами циськець мужыка, высмактываючи з няго паследнюю каплю крави, а кали мужик, выбиушысь з сил, взбунтуецца, вызываець на няго казакау?

Памешчики „Народовые-дамакраты“.

Хто стараецца на кожнем шагу пашкодзить жыдам, и разам з тым крычычь, же хочуць раунаправия для усех народовосьци?

„Народовые-дэмакраты“.

И яны ящэ маюць права называць сябе прияцелями народа,—смеюцьэ ящ пачкаць имя „дэмакратау“!

Польские рабочые и мужыки не выбирали дэпутатау у першую Думу и дзеля таго дэпутатами ад Царства Польскаго у Думе были тольки самые „народовые-дэмакраты“.

З якими дэпутатами у Думе яны, гэтые „прыяцели народа“, трымались? Чы з тыми, каторые дабивались для народа зямли и воли?

Не! Яны злучыли сваи галаса з тыми рускими дэпутатами, каторые были працуны гэтаму, каторые ясна были врогами народа.

А кали усе дэпутаты паехали у Выбарг и написали ад сябе писульку да народа, то „народовые-дэмакраты“ прыехали у Выбарг тольки для таго, каб адказацца падписать гэтаую писульку.

Усем гэтым яны надтаж добра паказали народу, жэ ихные абецанки были тольки адно кламства и ашуканства.

Мы цверда верым, жэ нас яны ня зловяць у сидлы.

Мы павинны як адзин злучыцца и з памеж сябе выбраць дэпутата, а не з памеж паноу, наших вечных крыудзицели и грабицелей.

Маланка.

Кандыдаты ад Вильни.

Баялась бедната, што не удасьцца ей у Вильни выставиць свайго кандыдата.

Аж рантам кандыдаты знайшлись, и не адзин, а целых два—ды ящэ якие!

Усяму Вильню вядомые и усеми у Вильни паважаемые.

Адзин—ксендз, усем знамый сваими браталюбивыми казаннями, а другий—абшчесьцвенный дзеяцель, праславиушийся любоую да ближних

Адзин — ксендз Станислау Мацеевич, другий—пан Юзеп Монтвилл.

Уздахнула свабодна бедната.

И не дзивота. Чаго-чаго яна не чекаець ад гэтых дэпутатау ад горада Вильни!

И бедный работник з сагнуушейся ад працы спинай верыць, што уздахнець ён свабодна, кали паслышыць, як виленские дэпутаты будуць трэбовоаць, каб скруцили яго рабочый дзень.

Яны, канешне, патребуюць: дайце рабочым восем часоу для працы, восем—для сну и восем свабодных.

И мужык будзе спаць спакойна, а дэпутат пахлапочець аб ним и патребуець у Думе, каб мужыкам дали дарам зямли, за каторую, па праудзе гаворучи, ужо у двайне грошы заплацили.

И жыд-бедняк абрадуецца: дэпутат будзець дамагацца, каб и жыд быу таким же гражданинам як усе у тым краю, у каторым жывець, и каб меу тые жэ самые права, што руский, паляк, литвин, беларус и другие.

Абыдва гэтые кандыдаты абецуюць бараниць справы усей працавитой беднаты.

Як же не паверыць таким вельмипаважаемым людзям?

А мы, хаць можэ гэта и вяликий грэх - ня верым им...

Ня верым им дзеля таго, што справы паноу и ксяндзоу ня тые, што нашы. Ня верым мы, каб паук кады нябудзь пажалеу муху.

Но можэ быць и гэтый пан, и гэтый ксендз такие добрые людзи, што яны забудуць аб сваей карысьци и выгадах, посвенцяць сябя на службу працавитай беднаце?

Можэ яны ужо гэта паказали сваими учынками?

Паглядзим...

Ксендз Мацеевич любиць гаварыць шмат и усё об адным и тым же. Усе яго казання з амбоны скярованы працыу цыцылистых, ученикоу ды жыдоу.

Ксендз Мацеевич нападаець на тых, хто хочечь добра народу и каго абецаець бараниць у Думе.

Другий кандыдат, пан Монтвилл, пасвенцаець сябе на службу народу: ён навэт зрабиу саюз работникау „стоважышене С-го Юзэфа“, ад катораго уцякае кожны пачцивы работник...

Пан Монтвилл маець маёнтки. Спытайце яго саседзей-мужыкоу, ды работникоу; чы многа яны видзели добраго ад няго?

У гэтых двух кандыдатау ёсць шмат агульнаго: у барбе з людьми, каторые мысляць иначэй як яны, як адзин, так другий гатовы прыбегнуць да самых брудных способоу и штук.

Два годы таму назадъ у Вильню прыехау польски писацель пан Немаеуски и чытау тут лекции. Гэтые лекции не спадабалися ксяндзу Мацеевичу. От жэ ксёндз Мацеевич сказау два слова и п. Немаеускага палиция выслала из Вильня, А трэба сказаць, жэ п. Немаеуски челавек разумны и сваими лекциями мог шмат карысьци прынясьци беднаму прыгныбённаму народу.

У Виленскам Зямельнам Банку, у каторым глауным заправилай п. Монтвилл и з катораго ён цягне шмат грошы, сталася бяда.

Панам гаспадарам банка паказалась, што разумы служашчых скярованы ня у тую сторану у каторую бы хацелась панам гаспадарам...

И от жэ адзин з гаспадарау гэтага банка пан Гуща, не знайшоу ничаго лепшага як пайсьци самому и ператрасьци усе сталы сваих служащих, чы нема там гдзе праклямации?

От жэ якие кандыдаты у Думу, каторых нам паказывюць паны. От якие меюць быць нашы бараницели.

Не, паны, не ашукаеце нас! Мы ведаем, жэ и бяз вас ёсць ящэ людзи на свеце... Есць ящэ и праудзивые прыяцели нашае справы. Мы ведаем, што за их працу для народнае справы и родзины, правицельства плациць им турмами и кулями, и змушае их хавацца ад Божага света як злодзеяу и разбойникау.

От гэтым людзям мы верым.

Мы не знайдзем з намеж них ни знатных, ни багатых, але пачцивых и справядливых.

И з намеж гэтых людзей мы выбярэм сабе дэпутата.

Адам.

Куды идуць мужыцкие грошы и як дастауляюць галодным мужыкам хлеб.

У за границы жывець адзин чэлавек, катораго завуць **Лидваль**,—а у нас, у рускам гасударстве, жывець адзин генэрал, катораго завуць **Гурко**.

Гэтый самый Лидваль занимаўся тым, што рабиу у нас для панау клюбы, гдзе паны ели, пили, играли у карты и гуляли з дзеуками.

Кали нашы мужыки пачали пухнуць з голаду, кали хлеб пякли з коры и мякины, руский генэрал прасиу Лидваля, чы ня

можэ ён даць раду. як гэтому гору памагчи и мужыкоу накормиць.

Лидваль, як чэлавек уж надта добрый, згадзиуся зрабиць гэту ласку и взяуся пастауляць хлеб для бедных мужыкоу.

А трэба сказаць, **жэ гетый самый Лидваль хлебам николи не таргавау** и разумеецэ ён у хлебе стольки, скольки доктар у сене.

Оiъ жэш тады генэрал дау Лидзалю васемсот тысячау руолеу (800,000), каб ён. заняуся ратаваннем галодных мужыноу.

Вот же цешились наши мужычки, же хыба больш галадаць не прыйдзецца, бо для гэтай справы аж з заграницы генэрал Гурко чэлавека выписау.

А хлеба ужо надтаж патрэба!

Узяу гэты грошы Лидваль и зхавау.

А гдзе жэ хлеб? --запытаецесь вы?

— А хлеба нема!

— Як то нема? А за штое же ён грошы узяу?

— А чамуж бы яму и не взяць, кали даюць? –Яму наш генэрал дау!

Гетый генэрал, здаецца, мае права робиць з нами и нашими грашми, што захочець.

А спытаць бы так: адкуль геты васемсот тысячау рублеу (800,000) узялись?

Чы не прышлось гэтаму самому мужыку. што цяперь галадаець, астатнюю кашулю прадаць на тые тысячы. што пэн генэрал заграничным куццам раздае?

Мужык ня еу, ня спау. тольки бы атдаць павиннасць зборщыку

Такая ужо мужыцкая нядоля!!!

А выходзиць так, што мужыцкие крававые грошы аддаюцца заграничным жуликам, каторым усё ровна. чы галадаець мужык, чы не.

Корч.

Усяго па троху.

Надтаж многа хлапот у нашаго беднаго правицельства

У прошлам гаду яно ваевало з рэвалюцiанерами, каторые были процiуны выбарам у Думу, а цяпер яно аж зэ скуры вылезае ваюючи з тыми рэвалюцiанерами, каторые хочуць выбiраць у Думу.

Да 1 акцябра 1906 года дэпартамэнт палиции бедавау аб тым, же рэвалюцiанэры агитуюць каб „не даваць рэкрутау".

Цяпер рэвалюцiанеры пяраменили с ваю тактыку и гэтым прымусили дэпартамэнт палиции, сакретна прадписываць, каб як можна стражэй пригдядали за тыми рэвалюцiанерами, каторые стараюцца, каб у армию з памеж навабранцеу прайшло. як можна больш сваих людзей.

И правицельства усё ваюець ды ваюець... И з тым каб „не даваць рэкрутау" ваюець, и з тым каб „даваць рэкрутау" ваюець...

Як вявюрка у калясе.

(Смоленск. Вѣсти.).

— **Скольки стоiць Рускiе генэралы.**—У 1905 году было на службе 1773 генэрала, акрамя тых, каторые у адстауцэ. Гэта выходзиць 1 генэрал на 565 салдатау.

Каб утрымаць 33 поуных генэралау у год стоiць 1 мильён 350 тысячау рублёу, — на утрыманне 357 генэралау - лейтэнантау идзе 2 мильёна 124 тысячы руб. и на 1006 генералау-маёрау 3 з палавиною мильёнау руб. Агулам для усих генэралау пайшло 7 мильёнау рублёу, не рахуючи наград, на каторые выходзяць у год дзесятки и сотни тысячоу рублёу. Затым на усялякiе награды и падмоги для генэралау и старых офицероу выдаецца у год больш як 4 мильёна рублёу. На пенсиёны для адстауных генэралау идзе больш як 11 мильёнау рублей.

На утрыманне 950 тысячнай армии салдатау выходзиць у год 45 мильёнау руб., а утрыманне тольки адных генэралау каштуе близка палавину гэтых грошэй.

Не трэба забываць и тое, же большая часць гэтых генэралау памещчики, з памеж каторыхъ, як напрымер. граф Игнатьеу, Варанцоу-Дашкоу меюць дзесятки и сотни тысячау дзесяцин зямли.

Есьць з памеж них ящэ и такiя, што маюць фабрыки и заводы. (Echo).

— **Заяуленне казакау.**—Дэпутат ад города Растова-на-Дану А. П. Хартахай палучыу ад 10-ай мабилизованай сотни, што цяпер займаець караулы, ды служыць па станциям жалѣзных дорог, заяуленне у каторым з памеж других ось як гавораць:

„Бацьки ды браты, каторые выбраны ад усего рускаго народа, каторые прызва-

ны самым Царомъ, нашым бацюшкаю! Вы павинны зрабиць тое, чаго дамагаецца наш руский народ—даць мужыкам зямли.

Паны-выбарщыки ад усяго света Хрыстова, просим вас. Мы казаки, пакинули сваих старыкоу бацьку и матку, жон и малюткиx дзяцей и разруйнавалась наша уся гаспадарка, а да таго ящэ Гасподзь Богъ не урадзиу нам грэшным хлеба, так, што наша сямья памираець з голаду. Паны-выбарщыки праваславные, просяць вас мабилизованые казаки, каторые нясуць ня слыханую службу. Мы ничаго ня можэм зрабиць з нашыми прамыми начальниками, яны нас наказываюць, яны нас мучаюць, кажуць, жэ будуць казниць на смерць, жэ запплюць у катаржные работы и атправлюць у полк на службу з першай калейкай. Усеми гэтыми угрозами яны нас страшаць, але нам усеж таки шкода трациць и убиваць адзин другога. Паны-выбарщыки, просим мы вас, пахлапачыце аб нашых бацьках, каторые нясуць цяжолую работу, яны нам пишуць, што ня могуць нясци гэту работу. Паночки, адпавядайце у газэтах".

(Страна).

З Беларуси и Литвы.

— **З Свенцянскаго павету, Виленск. губ.** — У вёсцы Зулово, Михайлоускай валасьци, крэсцьянинъ Флорьян Жеймо забиу сваю матку, 65-летнюю старушку. Прычына датуль ня выяснена

Минск. — У маёнтку гр. Тышкевича згарели 2 водзяные млыны. Млыны хтосьци падпалиу. Шкоды наличаюць на 17 тысяч рублёу.

— **Режыца,** — На сваих прадвыбарных зебраннях польские и руские памешчыки ни як не магли згаварыцца. Руские выбрали сабе камитэт и пастанавили адлучыцца ад палякоу. Kur. Lit.)

— **Вицебск.** — 7 и 8 наябра прибыушый у Вицебск судзебны следовацель па асобна важным справам п. Белеуцоу знимау дапрос з быушых члену Гасударственнай Думы п.п. А. Волковича и Г. Брука у справе аб выбаргскам вазванню. Прэдъяулены были ось якiя абвинення: 1) за тое, што яны падписали выбаргскае вазванне и 2) жэ яго шырыли памеж людзей. Да першаго абвинення яны прызнались, а да утарога - не хацели ничога яму гавариць и заявили, же скажуць тольки на судзе. (Сѣв.-Зап. Гол.).

— **М. Белыничи, Могил. губ.** — Вясной у гэтам гаду католики па канцам местэчка, як гэта дауней вадзилась, каля самых хат паставили чатырэ крэсты

У ближайшым касцеле у местечку Свециловичах не было ксендза и дзеля таго крэсты гэтые стаяли да восени не пасвенцоными. Здавалось бы гэтые крэсты никому ня шкодзили. А кали пабывау у Белыничах магилеуский архярэй, дык пасля таго 8 сенцября, мейсцовый станавый прыстау з урадником и стражниками пачали прыдзирацца да пастауленых крэстоу. Шмат разоу ужо становый зазывау да сябе мейсцовых католикоу, гразиу им и штрафам, и высылкаю, и яще падобными страхами и трэбавау ад них, каб дали падписку, же знимуць крэсты.

Затым станавый абьявиу, же па распараженню магилеускаго испрауника, яны маюць тольки тры дни сроку. Тады католики паслали хадакоу да ксяндза у Свециловичи з просьбаю, каб освяициу тые нешчастные крэсты. На другий дзень 4 акцябра приехау ксёндз на асьвянценне. Урадник зэ стражниками и цяпер ня дали спакою ни ксяндзу, ни людям. Станавый пасля таго страшыу и катаргай, и агромными штрафами, а раз навэт схвациу сякеру и крычау, же калиі каталики ня знимуць крэсты, то ён сам их зрубиць. Што будзе у перадзи? Што новаго палиция выдумаець? Выдумливаець яна ужо стольки, скольки хочэць. У пратаколе навэт и то памясьцили ня правильные и ня праудзивые паказанне стражникау, же як бы ксендз сказау уряднику „вон сабаки", а нарсд як бы падхвациу: „царские сабаки". Кламства, да катораго прыбегаюць праваслаунае духавенства и вернаслужащая яму палиция, заусем ужо вайшло у моду.

(Страна).

— **Минская губ.** — У павятовам зъезде зямлеуладзельцеу минскаго павету маюць право голасу 119 людзей, драбнейшых зямлеуладельцеу, каторые будуць выбираць на

прадвыбарных зъездах — 1810, и паноу и ксяндзоу — 50. Па санацким разъясненням, близка 1200 драбнейшым зямлеуладзельцам права голасу адняли.

(Рѣчь).

— **Вильня.** — Рускую газэту „Свободное Слово" за гэтый месяц канфискавали дзевяць разоу. Канфискавали яе и тагды, кагды у ней друкавали, и тагды, кагды выпусьцили газэту саусим бэз друку, парожнюю — были тольки загалоуки, ды подписи, а у сяродку парожняя белая бумага.

— У гэтым тыдню канфискавали литоускую газэту „Naujoji Gadyne".

— Рэдактора польскай газэты „Echo" Уладзимира Стойкова и рэдактора-выдауцу „Нашае Доли" Ивана Тукеркеса прыцягаюць да суда па 1 и 2 пунктам 129 ст. уст. уг. суд. и па пункту 6 отд. 8 урэмен. прав аб паурем. выданнях, за выдрукаванне артыкулау у сваих газэтах.

— З Виленскай турмы уцякли празъ печку 6 арыштантау. З памеж них 4 **„палитычных праступникау"**

---

*
* *

Вер — над нашым цемным краем
Солнышка узайдзе,
И лучом сваим асвециць,
Мужика у бядзе.

Ночь ня вечна будзе длицца.
Пабледнеець цень,
И займецца над зямлёю
Ясный, цихий дзень.

Гнет няволи векавечнай
З душ людзких спадзець
И свабодна, абнаулённа
Чалавек уздахнець.

Геля Нядольны.

Ад Редакции.

Першы, трэци и чацьверты нумэры „Нашае Доли" палиция канфискавала, так што ничога схаваць не удалося, и дзеля таго высылаць этых нумероу никаму ня можэм.

Просим усих нашых чытацелёу писаць аб усем, што дзеецца, аб крыудах сваих и радосьцях, хто як умее.

Кали патрэбна будзе каму якая парада — пытайце — адкажемо.

Ведайце добра, што „Наша Доля" — газэта вёсковых людзёу

Як раней, так и цяпер „Наша Доля" будзе бараниць справы вёсковаго и местоваго рабочаго народу и усей працавитай беднаты. Прысылаючы грошы просимъ цисаць, якое выданне „Нашае Доли" прысылаць: чы друкаваное рускими литэрами, чы польскими.

Хто хочэ получаць газэту, нехай паспешае з прысылкою грошэй.

Выдауца **Янук Тукеркес.**

За рэдактора **Адам Гедвилло**

Odbijano w drukarni M. Romma.